# З ПЕРШАМАЕМ, ТАВАРЫШЫ!

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 16 (1128) ● Чацвер, 29 красавіка 1976 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.




ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ! НАСТОЙЛІВА АВАЛОДВАЙЦЕ МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКІМ ВУЧЭННЕМ, ДАСЯГНЕННЯМІ НАВУКІ, ТЭХНІКІ І КУЛЬТУРЫ! ПАМНАЖАЙЦЕ СЛАЎНЫЯ РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ, БАЯВЫЯ І ПРАЦОЎНЫЯ ТРАДЫЦЫІ САВЕЦКАГА НАРОДА! БУДЗЬЦЕ Ў ПЕРШЫХ РАДАХ БАРАЦЬБІТОЎ ЗА ПАСПЯХОВАЕ ВЫКАНАННЕ РАШЭННЯЎ XXV З'ЕЗДА КПСС!

*(З Заклікаў ЦК КПСС да 1 Мая 1976 года).*

## У СВЯТОЧНЫХ КАЛОНАХ

**Святам шчасця і маладосці прыходзіць Першамай на нашу Савецкую зямлю. На вуліцы гарадоў і вёсак краіны выйдуць мільёны працоўных. Яны прынясуць рапарты працоўных дасягненняў, прадэманструюць сваю любоў, адданасць Камуністычнай партыі, роднай дзяржаве, вернасць ідэалам Леніна.**

**У калонах дэманстрантаў разам з будаўнікамі і рабочымі, настаўнікамі і ўрачамі, дзеячамі навукі і культуры пройдзе шматтысячная армія студэнтаў, аспірантаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ — буйнейшай навучальнай установы рэспублікі.**

**Пад лозунгам развіцця навукі і культуры ў дзесятай пяцігодцы калону БДУ ўзначаліць фізічны факультэт, які заняў першае месца ва універсітэце па выніках сацыялістычнага спаборніцтва за пяцігоддзе. У калоне факультэта, у першых яе радах пойдзе кафедра ядзернай фізікі, якую ўзначальвае прафесар С. С. Шушкевіч. Побач з ветэранамі вайны Я. А. Піскуновым, П. С. Фірсавым, Я. А. Лазарэнка на дэманстрацыю выйдуць студэнты і супрацоўнікі, узнагароджаныя знакамі ЦК ВЛКСМ «Малады гвардзеец пяцігодкі», знакамі «Ударнік-75», правафланговыя вучобы, выдатнікі У. Самойлаў, А. Зайцава, Л. Говар і іншыя.**

**«Мір, Май, праца!» — з такімі транспарантамі выйдуць на святочны парад працоўных студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі юрыдычнага факультэта, які з'яўляецца адным з лепшых факультэтаў па выніках паспяховасці. У яго першых радах будуць выкладчыкі і студэнты — пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва на факультэце.**

**«Працоўны семестр — на выдатна», «Студэнты — Радзіме» — такія лозунгі будуць узняты над калонамі ФПМ і мехмата. Больш як 100 студэнтаў механіка-матэматычнага факультэта пойдуць у форме байцоў СБА.**

**Актыўны ўдзел у дэманстрацыі прымуць замежныя студэнты, якія навучаюцца ў БДУ імя У. І. Леніна. «Мы інтэрнацыяналісты» — гавораць іх лозунгі.**

**Ёсць аб чым рапартаваць калектыву Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна: да Першамая ён прыйшоў з новымі поспехамі ў працы, вучобе, з навуковымі адкрыццямі.**

**Новыя гарызонты творчай працы адкрылі перад вядучай ВНУ рэспублікі гістарычныя рашэнні XXV з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і XXVIII з'езда Кампартыі Беларусі, над выкананнем якіх мэтанакіравана і самааддана працуюць амаль паўтаратысячная партыйная арганізацыя, увесь прафесарска-выкладчыцкі састаў, аспіранты і студэнты.**

**Сярод іх у святочных калонах пойдуць лепшыя работнікі БДУ, узнагароджаныя ордэнамі і медалямі СССР за дасягнутыя поспехі ў выкананні заданняў дзевятай пяцігодкі па падрыхтоўцы спецыялістаў для народнай гаспадаркі. Гэта— У. М. Сікорскі, член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР, рэктар БДУ, А. Я. Малышаў, прафесар, прарэктар па навуковай рабоце, І. П. Зяцькоў, дацэнт, дэкан фізічнага факультэта, Г. М. Ліўшыц, прафесар БДУ, В. М. Далгарукаў, начальнік вучэбнага аддзела, В. В. Казлова, дацэнт, загадчыца кафедры БДУ.**

**«Рашэнні XXV з'езда КПСС — у жыццё!» — пад такім дэвізам жыве і працуе калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта.**

## ЗЫХОДЗЯЧЫ З ПАТРАБАВАННЯЎ ПАРТЫІ

Інфармацыі і даклады аб стане палітыка-выхаваўчай работы ў інтэрнатах не аднойчы заслухоўваліся на паседжаннях парткома універсітэта.

Нядаўна адбыўся расшыраны актыў БДУ па рабоце ў інтэрнатах. У ім прынялі ўдзел адказныя за работу ў інтэрнатах ад партбюро, прафбюро, камітэтаў камсамола факультэтаў, старшыні студсаветаў.

З дакладам выступіў І. В. Марчанка, член парткома універсітэта, старшыня савета парткома па рабоце ў інтэрнатах. Ён адзначыў асноўныя напрамкі дзейнасці савета, пракаменціраваў патрабаванні XXV з'езда КПСС да выхаваўчай работы з моладдзю.

Аб стане выхаваўчай работы ў інтэрнатах расказаў намеснік дырэктара студгарадка па палітычнай частцы М. Сянкевіч. Па пытаннях работы радыёвузлоў у інтэрнатах паведаміў намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ В. Русак. На актыве выступілі прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце С. А. Ерамееў, старшыня студсавета інтэрната №2 І. Тырын і іншыя.

Актыў разгледзеў вынікі агляду-конкурсу інтэрнатаў, намеціў далейшыя задачы студсаветаў, звярнуў увагу на пашырэнне самадзейных пачаткаў у рабоце інтэрнатаў, узмацненне ролі студсаветаў у выхаванні ў кожнага жыхара ашчадных адносін да сацыялістычнай маёмасці.

Вынікі актыву вырашана абмеркаваць ва ўсіх прафсаюзных камсамольскіх арганізацыях, у маі правесці рэйд па інтэрнатах.



*27 красавіка ва універсітэце адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны святкаванню 1 Мая. Сход адкрыў прарэктар па навуковай рабоце прафесар А. Я. Малышаў. Дэкан філалагічнага факультэта А. А. Волк у сваім дакладзе падкрэсліў што сёлетні Першамай адзначан падзеяй вялікага гістарычнага значэння — адбыўшымся нядаўна XXV з'ездам КПСС. Дакладчык спыніўся на ўкладзе нашай навучальнай установы ў дзевятую пяцігодку. Універсітэт заняў І месца па выніках сацыялістычнага спаборніцтва сярод ВНУ рэспублікі.*

*У заключэнне святочнага сходу адбыўся канцэрт.*

Фота А. Басава і В. Драчова.

# РАШЭННІ XXV З'ЕЗДА КПСС—ВЫКАНАЕМ!

**20 красавіка адбыўся пленум камітэта камсамола універсітэта. З дакладам «Аб выніках XXV з'езда КПСС і задачах камсамольскай арганізацыі БДУ імя У. І. Леніна па далейшаму ўзмацненню камуністычнага выхавання моладзі» выступіў намеснік сакратара камітэта камсамола В. АНДРУХОВІЧ. На пленуме выступілі сакратары камсамольскіх арганізацый факультэтаў, камсоргі груп.**

**Даклад у скарачэнні прадстаўляецца вашай увазе.**

Савецкае студэнцтва, як і ўвесь савецкі народ у гэтыя дні, знаходзіцца пад уражаннем велічных рашэнняў XXV з'езда КПСС.

Камсамольцы БДУ імя У. І. Леніна глыбока вывучаюць рашэнні і матэрыялы з'езда, вызначаюць сваю ролю, сваё месца ў выкананні грандыёзных па сваёй значнасці задач дзесятай пяцігодкі.

**10 красавіка закончыўся Усесаюзны камсамольскі сход «Рашэнні XXV з'езда КПСС — выканаем!», у рабоце якога прымала актыўны ўдзел і наша адзінаццацітысячная арганізацыя.** На сходзе адзначалася, што крытэрыем поспеху ідэйна-палітычнага выхавання моладзі з'яўляюцца яе канкрэтныя справы. **Па-дзеламу, сур'ёзна і з адказнасцю аднесліся да правядзення сходаў камсамольскія арганізацыі ФПМ, механіка - матэматычнага і філалагічнага факультэтаў.**

Напярэдадні Усесаюзнага камсамольскага сходу бюро камітэта камсамола БДУ адобрыла ініцыятыву студэнтаў ФПМ, філалагічнага, фізічнага і хімічнага факультэтаў аб разгортванні масавага спаборніцтва акадэмічных груп пад лозунгам «Ніводнага адстаючага побач!» **У нас ужо ёсць пэўныя поспехі ў гэтым напрамку: 1389 студэнтаў універсітэта вучацца толькі на «выдатна», каля 4,5 тысячы — на «добра» і «выдатна».** На жаль, у большасці нашых арганізацый лозунг пакуль што застаецца толькі лозунгам, не падмацоўваецца канкрэтнымі справамі.

У рашэнні галоўнай задачы ВНУ — падрыхтоўцы высокакваліфікаванага спецыяліста, які б меў высокія духоўныя, маральныя якасці, — значную ролю адыгрывае грамадска - палітычная практыка студэнтаў. Яна — неад'емная частка вучэбна - выхаваўчага працэсу. Трэба падкрэсліць, што грамадска - палітычная практыка знаходзіцца яшчэ на этапе станаўлення і таму нясе ў сабе часта праблемнае, спрэчнае. Гэта — разнабой у формах і метадах правядзення, у ацэнцы вынікаў.

**Асноўнай праблемай работы камсамольскіх арганізацый па правядзенню грамадска - палітычнай практыкі з'яўляецца арганізацыя лекцыйнай прапаганды.** Перад лектарам стаіць задача не толькі выкладаць факты, не толькі правільна інтэрпрэтыраваць іх, але і ставіць перад слухачамі праблемы, прымусіць аўдыторыю па-новаму паглядзець вакол сябе. У нас кожны студэнт пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедр грамадскіх навук рыхтуе гутаркі і лекцыі. Аднак агітацыйна - прапагандысцкая работа вядзецца не на належным узроўні. Часта лекцыі рыхтуюцца па тэматыцы, якая не адпавядае патрабаванням дня, студэнт не ведае, перад кім ён будзе выступаць. І як вынік — пасіўны інтарэс да лекцыі ў слухачоў. Агітацыйна - прапагандысцкую работу студэнтаў нам трэба весці планава, каардынаваць сваю работу з райкомам, гаркомам і абкомам. **Дакладная сістэма лекцыйнай прапаганды павінна быць выпрацавана ў кожным камітэце камсамола факультэта, суаднесена з дзейнасцю таварыства «Веды».**

**На факультэце грамадскіх прафесій працуе школа маладога лектара.** Лекцыі для слухачоў чытаюцца нецікава, заняткі праводзяцца нерэгулярна, колькасць слухачоў з кожным годам памяншаецца. Нам трэба падумаць над тым, як актывізаваць работу школы і ўсяго ФГП у цэлым. Нашы падшэфныя школы і ГПТВ маюць патрэбу ў спецыяльных лекторыях: па гісторыі камсамола, па прапагандзе рашэнняў XXV з'езда КПСС і г. д. **Такі лекторый магла б весці група студэнтаў пры дапамозе выкладчыкаў кафедр грамадскіх навук.**

У апошні час мы ўсё часцей выкарыстоўваем такія паняцці, як «рэальны дыпломны праект», «рэальная курсавая работа». Гаворка ідзе пра такія навуковыя студэнцкія даследаванні, якія знаходзяць прымяненне, укараненне ў жыцці. Але, як правіла, гэтыя паняцці суадносяць з факультэтамі прыродазнаўчага профілю. **На наш погляд, гуманітарныя факультэты таксама маюць права на рэальную студэнцкую навуковую работу.** Апублікаваная ў друку праца студэнта-гісторыка, журналіста, філолага, юрыста, якая выкарыстоўваецца партыйнымі і камсамольскімі работнікамі, відаць, мае ўсе падставы лічыцца рэальнай. У нас у горадзе ёсць шмат арганізацый, якія маюць багатую гісторыю. Нядаўна гарком камсамола даручыў камсамоліі універсітэта ўдарную справу — напісаць гісторыю Мінскай гарадской камсамольскай арганізацыі. **Група студэнтаў-гісторыкаў ужо разгарнула работу па стварэнню гісторыі камсамольскай арганізацыі трактарнага завода.**

19 сакавіка 1976 года адбыўся V пленум ЦК ВЛКСМ. Пленум пастанавіў: разгарнуць спаборніцтва камсамольцаў і моладзі краіны за права падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола Цэнтральнаму Камітэту КПСС да 60-годдзя Кастрычніка. Апіраючыся на вопыт арганізацыі і правядзення спаборніцтва за права падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола XXV з'езду КПСС, нам неабходна ліквідаваць некаторыя хібы і правесці спаборніцтва на больш высокім узроўні.

Мы ўжо не раз падкрэслівалі, што грамадска - палітычная практыка — адна з частак Ленінскага заліку. Факультэцкім камітэтам камсамола, камсамольскаму актыву трэба растлумачыць суаднюсіны Ленінскага заліку з грамадска - палітычнай практыкай. Камсамольскія арганізацыі, якія не прынялі асабістыя комплексныя планы «Вучыцца камунізму», павінны выправіць становішча да пачатку мая.

Важнай падзеяй у жыцці камсамольскай групы з'яўляецца Ленінскі ўрок. Ён прадугледжвае сістэматычнае самастойнае вывучэнне твораў класікаў марксізму - ленінізму, дакументаў партыі, асэнсаванне іх і непасрэднае выкарыстанне ведаў на практыцы. **У маі у камсамольскай арганізацыі БДУ будзе праходзіць Ленінскі ўрок «Партыя — розум, гонар, сумленне нашай эпохі». Ленінскі ўрок павінен прайсці ў групах у форме ўрачыстага сходу - дыспуту, прысвечанага дзейнасці КПСС.**

Камсамольская арганізацыя універсітэта накапіла пэўны вопыт маральна - эстэтычнага выхавання студэнтаў. Значна ўзрасла якасць усіх напрамкаў самадзейнай творчасці студэнтаў. Шмат робіцца і на факультэтах. Так, на філфаку праводзімыя культурна - масавыя мерапрыемствы ўжо выстройваюцца ў пэўную сістэму. **Мы лічым сваёй задачай далейшае развіццё супрацоўніцтва з творчымі аб'яднаннямі, тэатрамі горада Мінска.** Разам з тым мы павінны адзначыць, што ў сістэме маральна - эстэтычнага выхавання ў нас ёсць шэраг пралікаў і недахопаў. Двойчы выступалі перад студэнтамі артысты Тэатра оперы і балета, але ў зале сядзела 100—120 чалавек. Гэта вельмі нязначная частка ўсяго студэнцтва!

Прымушаюць задумацца адносіны некаторых студэнтаў да сацыялістычнага агульнага жыцця. Неабходна па-новаму разгарнуць работу ў інтэрнатах.

**Вялікі размах атрымала работа па ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі ў перыяд падрыхтоўкі да 30-годдзя Перамогі савецкага народа над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Ва універсітэце працуе група «Доўг». Яна ўжо устанавіла 254 прозвішчы герояў, былых студэнтаў і выкладчыкаў БДУ, загінуўшых у гады вайны.** Ужо стала традыцыяй правядзенне зорных паходаў па месцах баявой і працоўнай славы савецкага народа.

У заключэнне хочацца зноў звярнуцца да XXV з'езда КПСС. З'езд даў высокую ацэнку дзейнасці камсамола, але адначасова паставіў перад намі новыя задачы павышэння якасці работы ўсіх звенняў камсамольскіх арганізацый, удасканалення сістэмы камуністычнага выхавання, фарміравання ў кожнага маладога чалавека глыбокай камуністычнай перакананасці і пачуцця адказнасці за свае справы і ўчынкі. Мы павінны апраўдаць давер'е з'езда.




# ЧАС ПАТРАБУЕ НАТХНЕННЯ

**Завяршальны год дзевятай пяцігодкі знамянальны для фізічнага факультэта тым, што па выніках сацыялістычнага спаборніцтва факультэт заняў першае месца ва універсітэце. Немалая заслуга ў гэтым камсамольскай арганізацыі фізфака.**

**У цэнтры ўвагі камітэта камсамола заўсёды знаходзяцца пытанні камуністычнага выхавання моладзі, павышэння паспяховасці і якасці ведаў. Праведзеная на факультэце вучоба камсамольскага актыву «Мэты і задачы грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў, формы і метады яе правядзення» ў многім садзейнічала пазбегнуць фармалізму пры правядзенні атэстацыі, стварэнню творчай атмасферы ў жыцці камсамольскай арганізацыі, прыцягненню студэнтаў да актыўнага грамадскага жыцця.**

**Асаблівы ўздым у рабоце адчуваўся напярэдадні XXV з'езда КПСС. Ва ўсіх камсамольскіх групах прайшлі сходы, на якіх абмяркоўваўся праект ЦК КПСС «Галоўныя напрамкі развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гг.». 110 камсамольцаў-фізікаў прайшлі маршрутамі «Зорнага паходу» па месцах баявой і працоўнай славы бацькоў, выступілі з лекцыямі і дакладамі па пуцёўках таварыства «Веды».**

**Шырокі размах у камсамольскай арганізацыі факультэта атрымала сацыялістычнае спаборніцтва за права падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола XXV з'езду КПСС.**

**Спаборніцтва паспяхова завершана. 89 лепшых камсамольцаў факультэта, якія падпісалі Рапарт ва ўрачыстай абстаноўцы, узнагароджаны памятнымі кнігамі ЦК ВЛКСМ «Вучыцца камунізму» і значкамі «Ударнік-75».**

**Прайшоўшы ў перадз'ездаўскія дні апошні этап Ленінскага заліку пад дэвізам «XXV з'езду КПСС — дастойную сустрэчу» паказаў узросшую актыўнасць камсамольскіх груп, асобных камсамольцаў.**

**Як важнае мерапрыемства, якое павышае ролю члена ВЛКСМ, баявітасць камсамольскай групы, разглядае камітэт камсамола фізфака абмен камсамольскіх дакументаў. У перыяд абмену праводзяцца тэматычныя камсамольскія сходы «Ты на подзвіг клічаш, камсамольскі білет», грамадска-палітычныя чытанні, індывідуальныя субяседаванні.**

**На паседжанні камітэта камсамола неаднаразова заслухоўваліся справаздачы кафедр, патокаў па ідэйна-палітычнаму і маральнаму выхаванню моладзі, кіраўніцтву камсамольскімі групамі.**

**Глыбокае вывучэнне матэрыялаў XXV з'езда КПСС і іх прапаганда — галоўная задача, якая стаіць перад камсамольскай арганізацыяй факультэта поруч з добрай вучобай. «Данесці ідэі з'езда да кожнага камуніста, да кожнага савецкага чалавека, — указваецца ў дакладзе Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева, — такі ганаровы абавязак не толькі прапагандыстаў, лектараў, дакладчыкаў, але і ўсіх нашых партыйных актывістаў. У гэтую работу трэба ўкласці ўсе свае веды, усё ўменне пераконваць, усю сілу душы. Ва ўсім гэтым — адна з перадумоў няўхільнага ажыццяўлення рашэнняў з'езда».**

**Глыбокае авалоданне ідэямі з'езда — задача, разлічаная на працяглы перыяд. Нядаўна на факультэце быў праведзен Усесаюзны камсамольскі сход «Рашэнні XXV з'езда КПСС — выканаем». На гэтым сходзе выпрацаван і зацверджан шэраг мерапрыемстваў камітэта камсамола фізічнага факультэта па вывучэнню, прапагандзе, выкананню рашэнняў XXV з'езда КПСС і далейшаму ўзмацненню камуністычнага выхавання моладзі. Камсамольскай арганізацыі неабходна стварыць атмасферу глыбокага і ўсебаковага вывучэння і прапаганды матэрыялаў XXV з'езда КПСС; арганізаваць сустрэчы з дэлегатамі XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ; правесці Усесаюзны Ленінскі залік «Рашэнні XXV з'езда КПСС — у жыццё» са штогадовай грамадска-палітычнай атэстацыяй; разгарнуць у кожнай камсамольскай групе спаборніцтва за права падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола ЦК КПСС да 60-годдзя Вялікага Кастрычніка; правесці Ленінскі ўрок «Партыя — розум, гонар і сумленне нашай эпохі» і шэраг іншых мерапрыемстваў.**

**М. ЛУКАШЭВІЧ.**

# ПОШУК

Ідзе камсамольскі сход. У аўдыторыі шумна. Ужо некалькі разоў прыадчыняліся дзверы: заглядваюць цікаўныя. Камсамольцы вырашылі: газета павінна быць! Жадаюць выступіць усе, абыякавых няма. Дык у чым жа справа?

Прайшоў першы семестр вучобы, а насценная газета групы выйшла толькі адзін раз. І дзеля справядлівасці трэба сказаць, што народжана яна была, як кажуць, у пакутах. Колькі разоў можна было пачуць ад рэдактара насценгазеты Марыі Мітраховіч:

— Членам рэдкалегіі застацца пасля заняткаў.

Яны заставаліся, рэдактар упрошваў:

— Напішыце заметкі!

У адказ розныя адгаворкі — усе заняты. Смешна, але і плачэўна. Ды гэта сапраўды так. І вось каторы раз сакратар камсамольскага бюро Віктар Дудко просіць уносіць прапановы. Тут ужо, на паседжанні бюро, выступаюць усе, разгараецца спрэчка — якой быць газеце?

— Я прапаноўваю усю нашу вучэбную групу раздзяліць на падгрупы па чатыры-пяць чалавек, і кожная такая групка раз у два тыдні будзе выпускаць свой нумар «Крыніц»,— унёс прапанову Міша Халімончыкаў.

Ужо выйшаў першы выпуск. Матэрыялы падабраны разнастайныя і цікавыя. Газета маляўніча аформлена. Не дзіўна, што яе чыталі ўсе.

Наватарства ў падрыхтоўцы і выпуску насценнай газеты дае магчымасць прыцягнуць да работы ўвесь калектыў, выклікае групы на спаборніцтва за лепшы нумар. Будзем спадзявацца, што новы метад выпуску насценнай газеты апраўдае сябе.

У. ДЗЯТЧЫК.

# ШЭФСТВА—СПРАВА ЎДАРНАЯ

Шырокае прызнанне на філалагічным факультэце атрымаў вопыт работы школы «Юны філолаг», якой кіруе выкладчык А. Станюта. Заняткі ў гэтай школе дапамагаюць рабятам вызначыць выбар сваёй будучай прафесіі. Гурткі юных філолагаў створаны ў многіх падшэфных школах факультэта. У іх рабоце заняты непасрэдна самі студэнты. Практыка паказвае, што ў тых школах, дзе заняткі ідуць на высокім арганізацыйным узроўні, школьнікі лепш вучацца, актыўней займаюцца грамадскай работай.

У шэфаў з філалагічнага факультэта ёсць ужо многа традыцый. Адна з іх — выезды агітбрыгад у школы. Вялікі інтарэс у школьнікаў выклікаюць выступленні удзельнікаў факультэцкага літаратурнага аб'яднання «Узлёт». На сустрэчы з ветэранамі, лекцыі і гутаркі, іншыя мерапрыемствы філфака запрашаюцца рабяты з падшэфных школ.

Нядаўна для вучняў сярэдняй школы № 17 г. Мінска была арганізавана сустрэча з замежнымі студэнтамі, якія навучаюцца ў БДУ. Цікава і змястоўна прайшоў вечар у падшэфнай Красненскай школе. Школьнікаў усхвалявалі вершы маладых паэтаў А. Пісьмянкова і В. Марука. У гэтай жа школе шэфы-філолагі дапамаглі ў афармленні вучэбных кабінетаў, сабралі ў падарунак школьнікам бібліятэчку беларускай прозы і паэзіі, выпусцілі літаратурны альманах.

Вялікія магчымасці работы з падшэфнымі маюцца і ў перыяд трэцяга працоўнага семестра. Праца школьнікаў у саставе студэнцкага будаўнічага атрада — не толькі яркае праяўленне актыўнасці рабят, іх грамадзянскага сталення, але і вялікая дапамога ў выбары прафесіі. Студэнты філфака прапанавалі шырэй прыцягваць у СБА не толькі цяжкавыхоўваемых падлеткаў, але і тых, хто добра вучыцца, грамадскі актывіст. Гэта стварае ў рабят, на наш погляд, большую зацікаўленасць у вучобе. Важную ролю ў пытанні прафарыентацыі моладзі павінны адыграць і ПАСы— працоўныя атрады старшакласнікаў, камандзірамі і камісарамі якіх едуць студэнты.

Шэфская работа — справа цікавая і патрэбная. Камсамольскія актывісты філфака спрабуюць знайсці свае, новыя формы работы, імкнуцца, каб шэфства стала важнай справай кожнага камсамольца, кожнага студэнта факультэта.

І. ФЕДАРОВІЧ,
член камітэта
камсамола філфака.

